МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

18 верасня 2020 г. № 35 (571)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

У ЦЭНТРЫ ЎВАГІ

НА 750 МІЛЬЁНАЎ ДОЛАРАЎ

плануецца заключыць кантрактаў на Форуме рэгіёнаў Беларусі і Расіі

Днямі ў фармаце відэаканферэнцыі адбылося сумеснае пасяджэнне беларускай і расійскай частак аргкамітэта па падрыхтоўцы і правядзенню VII Форуму рэгіёнаў Беларусі і Расіі. З беларускага боку пасяджэнне вёў намеснік старшыні Савета Рэспублікі Анатоль ІСАЧАНКА.

Суразмоўцы ў Мінску і Маскве ў пэўным сэнсе зверылі гадзіннікі. Яны прайшліся яшчэ раз па праграме асноўных мерапрыемстваў, абмеркавалі асобныя дэталі, удакладнілі тэмы секцый, месцы і фармат іх правядзення, колькасны склад выступоўцаў, транспартнае забеспячэнне дэлегацый і многія іншыя арганізацыйныя пытанні, якія заўсёды спадарожнічаюць такім буйным міжнародным падзеям.

Нагадаем, тэма форуму — «Гістарычная спадчына Вялікай Перамогі як аснова развіцця сацыяльна-эканамічных і духоўных сувязяў народаў Беларусі і Расіі». Члены аргкамітэта з абодвух бакоў правялі вялікую ўвагу да работы літаральна кожнай секцыі, якія пройдуць у Мінску і Мінскай вобласці. Старшыні пастаянных камісій Савета Рэспублікі Сяргей Сівец, Віктар Лісковіч, Міхаіл Русы, Сяргей Рачкоў і Таццяна Рунец праінфармавалі маскоўскіх калег пра стан падрыхтоўкі пасяджэнняў секцый і іншых мерапрыемстваў форуму.

Анатоль Ісачанка як сустаршыня аргкамітэта паведаміў, што сёлета фармат правядзення форуму крыху змяніўся: з-за каранавіруса пасяджэнні секцый і шэраг іншых мерапрыемстваў форуму ў першы дзень пройдуць у відэафармаце. У другі дзень работа працягнецца ў рэжыме афлайн. Цэнтральнай падзеяй форуму стане пленарнае пасяджэнне, дзе мяркуецца падсумаваць вынікі дзейнасці секцый, абмеркаваць ключавыя пытанні і прыняць выніковы дакумент. Таму арганізацыі правядзення гэтага мерапрыемства ў час відэаканферэнцыі была нададзена асаблівая ўвага.

Усяго на форуме будуць працаваць пяць секцый па наступнай тэматыцы: парламенцкае супрацоўніцтва, сумесныя эканамічныя праекты, подзвіг савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, супрацьдзеянне гераізацыі нацызму, павышэнне актыўнасці сельскай моладзі. У гэтым сэнсе цікавай абяцае быць праца ўдзельнікаў секцыі № 4 у Дзяржынскім раёне на базе слыннага аднайменнага агракамбіната «Дзяржынскі». Там запланавана абмеркаванне пытанняў замацавання моладзі на вёсцы, павышэння яе сацыяльна-экамічнай актыўнасці ў аграпрамысловым сектары.

Удзельнікі секцыі № 5 будуць весці гаворку пра пашырэнне сумесных намаганняў Беларусі і Расіі ў справе супрацьдзеяння гераізацыі нацызму на міжнародных пляцоўках. Работа секцыі адбудзецца ў Беларускім дзяржаўным музеі гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

У Жодзіна на базе завода БелАЗ пройдзе пасяджэнне секцыі № 2. У цэнтры ўвагі яе ўдзельнікаў будзе ў асноўным эканоміка.

Запланавана таксама сумеснае пасяджэнне дзелавых саветаў Беларусі і Расіі, экспертная сесія высокага ўзроўню на тэму «Адукацыя як аснова гістарычнай памяці і далейшага інтэграцыйнага развіцця Саюза Беларусі і Расіі», правядзенне беларуска-расійскага маладзёжнага форуму.

На пасяджэнні Міжпарламенцкай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь і Савета Федэрацыі Федэральнага Сходу Расійскай Федэрацыі па міжрэгіянальным супрацоўніцтве будзе разгледжаны шэраг актуальных для дзвюх краін пытанняў. Напрыклад, аб удасканаленні рэгіянальнага супрацоўніцтва. Удзельнікі форуму таксама прааналізуюць ход выканання дакументаў, прынятых на папярэдніх форумах, абмяркуюць розныя аспекты пашырэння развіцця навукова-тэхнічнага супрацоўніцтва.

Мяркуецца правядзенне сустрэчы старшыні Савета Рэспублікі і старшыні Савета Федэрацыі з кіраўнікамі рэгіёнаў Беларусі і суб'ектаў Расійскай Федэрацыі.

Што датычыцца эканамічнага складніка форуму, у размове з журналістамі Анатоль Ісачанка падкрэсліў: запланавана заключыць камерцыйныя кантракты прыкладна на 750 мільёнаў долараў. Паводле яго слоў, гэта вышэй за ўзровень папярэдняга форуму. Усяго мяркуецца заключыць крыху больш за 70 кантрактаў і пагадненняў, у іх ліку міжурадавыя дакументы, пагадненні паміж губернатарамі, абласнымі Саветамі дэпутатаў беларускіх і расійскіх рэгіёнаў.

Самы значны кантракт чакаецца паміж ААТ «Магілёўхімвалакно» і расійскім прадпрыемствам «Авангард» — на суму звыш 30 мільёнаў долараў. Гэты кантракт будзе падпісаны на пленарным пасяджэнні.

Леанід ТУГАРЫН.

АДНОСІНЫ КРАІН МОГУЦЬ РАЗВІВАЦЦА ТОЛЬКІ НА АСНОВЕ ЎЗАЕМНАЙ ПАВАГІ

Прэзідыум Савета Рэспублікі адрэагаваў на рэзалюцыю літоўскага сейма

На выязным пасяджэнні прэзідыума, які прайшоў у гарпасёлку Смілавічы Чэрвеньскага раёна Мінскай вобласці, кіраўніцтва верхняй палаты беларускага парламента зацвердзіла дакумент, у якім канстатуецца, што рэзалюцыя Сейма Літоўскай Рэспублікі ад 10 верасня 2020 года не адпавядае духу добрасуседства паміж краінамі і ўніверсальным парламенцкім прынцыпам.

«Прыняццем гэтага дакумента літоўскія парламентарыі груба ўмешваюцца ва ўнутраныя справы Рэспублікі Беларусь і праяўляюць адкрытую непавагу да суверэннага права беларускага народа самастойна выбіраць кіраўніцтва і вызначаць шлях развіцця сваёй краіны», — каментуецца дзеянне літоўскіх калег.

Акрамя таго, спроба літоўскіх дэпутатаў прызначыць «лідара народа Беларусі» знаходзіцца па-за межамі здаровага сэнсу. Такія дзеянні, на думку членаў Прэзідыума Савета Рэспублікі, расцэньваюцца як правакацыйныя і недапушчальныя, парушаюць нормы міжнароднага права і міждзяржаўных зносін, існуючую парламенцкую практыку.

«Асаблівае непрыманне выклікаюць заклікі аказваць санкцыйны ціск на беларускія ўлады з мэтай змянення ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь», — акцэнтуецца ўвага ў дакументе.

Беларускія парламентарыі ўпэўненыя ў тым, што адносіны краін-суседак могуць плённа развівацца толькі на аснове ўзаемнай павагі, канструктыўнага ўсебаковага супрацоўніцтва, у тым ліку з выкарыстаннем міжпарламенцкага ўзаемадзеяння і з выключэннем умяшання ва ўнутраныя справы адна адной.

Вольга АНУФРЫЕВА.

МЕРКАВАННЕ

«Ёсць усе падставы меркаваць, што будзе ўзмоцнена роля мясцовага самакіравання»

Андрэй СЫЧ, беларускі палітолаг:

— Наша краіна стаіць на парозе сур'ёзных грамадска-палітычных змен. Ужо ў 2021 годзе на рэферэндуме нам неабходна будзе прыняць новую Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь.

Цалкам відавочна, што за кароткі перыяд сваёй суверэннай гісторыі беларусамі праведзена грунтоўная работа па станаўленні дзяржаўнасці. У складаныя гады пасля развалу СССР мы выстаялі, змаглі захаваць найлепшае, а сёння актыўна развіваем новыя галіны эканомікі. Беларусь стала адной з вядучых краін у сферы інфармацыйных тэхналогій, запускае ўласныя касмічныя спадарожнікі і ўступіла ў клуб краін, якія выкарыстоўваюць мірны атам.

Сёння перад краінай стаяць новыя выклікі і пагрозы. Свет перастаў быць лінейным, усе сферы жыцця чалавека набываюць тэмпы экспанентнага развіцця. Важна, што кіраўніцтва краіны гэта разумее і прымае адпаведныя меры. Яшчэ ў 2019 годзе былі анансаваныя змяненні ў Асноўны Закон краіны. Адной з важных паправак у Канстытуцыі стане пераразмеркаванне паўнамоцтваў паміж органамі ўлады.

Ёсць усе падставы меркаваць, што будзе ўзмоцнена роля мясцовага самакіравання. Гэта своеасаблівы адказ на запыт у больш актыўным удзеле грамадзян у прыняцці рашэнняў, які цяпер афарміўся ў грамадстве. Людзі хочуць непасрэдна ўплываць на тое, што адбываецца ў іх горадзе, вёсцы, на вуліцы.

Мяркую, што больш сур'ёзныя паўнамоцтвы атрымае парламент Беларусі. Хутчэй за ўсё, менавіта ён будзе фарміраваць урад краіны. Гэта дазволіць дэпутатам «запытваць» з міністраў наконт праведзенай імі работы, рэалізацыі дзяржаўных праграм. У сваю чаргу, і кожны грамадзянін праз абранага дэпутата ў сваёй акрузе будзе ўплываць на самыя важныя для краіны рашэнні.

Відавочна, будзе мяняцца і выбарчае заканадаўства. Прапарцыянальна-мажарытарная сістэма выбараў надасць вялікую ролю і значнасць палітычным партыям. Прэзідэнцкія выбары 2020 года шмат у чым і сталі такімі гарачымі, паколькі многія кандыдаты ішлі на іх толькі з мэтай прэзентаваць сябе з высокай трыбуны. Гэтыя выбары не сталі канкурэнцыяй праграм па фарміраванні лепшага будучага для беларусаў, але ператварыліся ў самапіяр і пэўную дзейнасць на перспектыву. Цікава, што цяпер ужо трое экс-кандыдатаў заявілі аб намеры ўтварыць палітычныя партыі. Лічу аднак, што пасля такіх палітычных кульбітаў яны не змогуць разлічваць на сур'ёзную падтрымку на выбарах любога ўзроўню. Між тым варта чакаць і з'яўлення партыі ад афіцыйнай улады. Адзначу, што сёння вялікая колькасць беларусаў былі не па сваёй волі палітызаваныя і ўцягнутыя ў пэўнае супрацьстаянне на вуліцах краіны. Рабочыя прадпрыемстваў, урачы, настаўнікі, якія выходзілі на мітынгі ў падтрымку эвалюцыйнага развіцця краіны, стануць асновай такой партыі. Пры ўсёй разнастайнасці меркаванняў, якія існуюць у нашым грамадстве, важна пабудаваць устойлівую дзяржаўную мадэль, якую ніхто не зможа разбурыць.

Змяненні ў Канстытуцыю — вельмі сур'ёзны крок для лёсу ўсёй краіны. Напрыканцы падрыхтоўкі асноўных паправак іх, безумоўна, неабходна вынесці на «суд» грамадскасці. Галоўнае, каб меркаванне кожнага чалавека было пачута. Пасля рэферэндуму мы мусім атрымаць па-сапраўднаму народную Канстытуцыю. Яна будзе спрыяць кансалідацыі грамадства і акрэсліць абсяг будучыні нашай краіны.